# КАЛЯНДАРНА-ПЕСЕННЫ ЦЫКЛ У КАНТАЦЕ «ВЯСКОВЫЯ СВЯТЫ» У. КУЗНЯЦОВА

***Сярнова Тамара Вячаславаўна,***
кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт
***Чарняк Валянціна Адольфаўна***
кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт
УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны
ўніверсітэт імя Максіма Танка» (Рэспубліка Беларусь).

*Анатацыя.* Артыкул прысвечаны кантаце "Вясковыя святы" В. Кузняцова і ролі фальклорных песенных традыцый беларусаў у творчасці кампазітара.

*Ключавыя словы:* фальклор, традыцыя, фальклорная стылістыка і сучасная музычная мова, восеньскія песні.

Важнай часткай традыцыйнай нацыянальнай культуры народа з'яўляецца фальклор. Гэты феномен прыцягвае ўвагу многіх кампазітараў. Народная песня, яе паэтычнае і меладычнае багацце заўсёды з'яўлялася прадметам іх увагі, якія ў той ці іншай меры звярталіся да народна-песенных вытокаў, чэрпалі тэмы і сюжэты, мелодыі і інтанацыі.

Кожны з твораў знаходзіць свой яскрава-індывідуальны стыль у адносінах да фальклору. Адсюль і розны іх падыход да аўтэнтычнага матэрыялу, музычнай рэканструкцыі першакрыніцы ў кампазітарскай практыцы.

У беларускай сучаснай музыцы ў рамках "новай фальклорнай хвалі" з'явіўся цэлы шэраг твораў, у якіх фальклорная вобразнасць з'явілася вызначальным фактарам зместу, формы, жанру, стылю. У іх той жа стылёвы сінтэз, які дазваляе аднесці гэтыя творы да сучасных, якія ўвабралі рысы новага творчага мыслення. Асаблівае месца ў гэтай жанравай разнавіднасці займаюць фальклорныя цыклы, кантаты, дзе сфакусаваныя самабытныя бакі жыцця беларускага народа. Адметнай асаблівасцю падобнага роду твораў з'явілася шырокае выкарыстанне характэрных рыс фальклору і перш за ўсё – паэтычнага. Яны належаць да фальклорна-арыентаванаму кірунку, дзе праяўляецца ва ўсёй паўнаце індывідуальнае аўтарскае бачанне музычнай і паэтычнай народнай культуры. Большасць з партытур арыентаваны на традыцыю абрадавага фальклору, які прадстаўляе сабой "... сукупнасць традыцыйных умоўных дзеянняў", якія сімвалічна выказваюць і замацоўваюць "... стаўленне людзей да прыроды і паміж сабой, іх паводзіны ў важных жыццёвых сітуацыях, якія сістэматычна паўтараюцца" [3, с. 13].

Вопыт аб'яднання фальклорнай стылістыкі і сучаснай музычнай мовы, распрацоўка арыгінальных фальклорных жанраў, спецыфічных выканальніцкіх прыёмаў, інтэрэс да паэтычнага зместу народных песень – усё гэта характэрна для вакальна-харавых цыклаў Вячаслава Кузняцова. Асаблівасці беларускага фальклору знайшлі адлюстраванне ў сюіце для голасу з аркестрам "Вясельныя песні" (сл. народныя), "Жаночыя песні" (сл. народныя), харавыя цыклы "Застольныя" (сл. народныя), "Вяселле" (сл. народныя) і інш. Сярод іх кантата "Вясковыя святы" для хору і камернага ансамбля (сл. народныя) якая была напісана па матывах каляндарна-абрадавага цыклу, яна складаецца з сямі частак: "Святы вечар", "Масленіца", "Вясна – красна", "Купалле", "Жніво", "Восеннь", "Талака". Кампазітар не імкнуўся ў сваім творы адлюстраваць увесь каляндарна-абрадавы

цыкл. Ён уключыў у кантату толькі тыя абрады, якія на думку В. Кузняцова з'яўляюцца ключавымі, знаходзіць іх арыгінальнае драматургічнае рашэнне, што характэрна для яго музычнай стылістыкі. У якасці прыкладу разгледзім шосты нумар "Восень".

Песнямі гэтай пары года завяршаецца гадавы круг земляробчага календара. Асаблівасць "восеньскай" мелодыі – перавага песеннага пачатку, якую кампазітар "прыцягнуў" у шостую частку "Восень" кантаты "Вясковыя святы". Да гэтых песень адносяцца "Ярынныя", "Ільнавыя" і выконваліся яны падчас уборкі лёну. Наступ восені азначала і прыход вясельнай пары (чаканне дзяўчынай далёкай дарогі, прадчуванне хуткага растання з родным домам, развітанне з маці). Форма дыялогу надае кампазіцыі складнасць і эмацыйнасць. Песня перадавала нялёгкую долю дзяўчыны ў замужжы:

*"А я маю жаль на зязюлечку,*
*Што рана кукавала.*
*А я маю жаль на цябе мамка,*
*Што я ў цябе не шуляла.*
*Ні я гулала, ні я гуляла..."*

У шостай частцы кантаты "Восень" В. Кузняцоў не ставіць мэтай максімальна наблізіцца да песеннага першакрыніцы, не выкарыстоўвае цытат. Для яго важна стварыць пэўны настрой, уласцівы "восеньскім" песням, у якіх выяўляецца тэндэнцыя да свабоднага распеву.

Форма "Восені" трохчасткавая. Першы раздзел адкрываецца тэмай дудкі, пабудаванай на кварта-квінтавых інтанацыях ў вольным метрарытмічным афармленні. Затым – выступ хору, гукавая тканіна якога бярэ на сябе сэнсавую нагрузку. Стварае карціну восеньскага пейзажу санорыка – перавага фанічнага маляўнічага спалучэння музычных гукаў. Паэтычны тэкст сыходзіць на другі план – кампазітар выкарыстоўвае адно слова "восень", на якім будуецца музычнае развіццё.

Для другога раздзелу В. Кузняцоў выкарыстоўвае паэзію, дзе спалучаюцца прыкметы восеньскай пары (ападае лістота, трывожна рыкае мядзведзь у лесе ў прадчуванні зімовай спячкі, пара "капельку браці", ляцяць жураўлі) з глыбокімі перажываннямі чалавека. Музычны матэрыял пабудаваны на супастаўленні двух груп галасоў – жаночай і мужчынскай. На фоне асцінатна-сінкапіраванага гучання басоўаднагалосна гучыць асноўная тэма ў тэнараў, якая пабудавана на прызыўной квартавай інтанацыі. У жаночым хоры ўтвараецца своеасаблівы сінтэз санарных сугуччаў на слове "рана, рана" з аднаго боку і поўнага паўтарэння другога поўрадкоў'я тэмы тэнараў на словы "мядзведзь ракаіць". Другая палова паэтычнага тэксту "рыдай не рыдай, я не баюся, толькі баюся восеньскай ночы" гучыць у альтаў і сапрана, харавая фактура якіх вытрыманая ў гетэрафонных сугуччах. Рэпрыза вяртае ў настрой першай частцы.

Музычны матэрыял кантаты "Вясковыя святы" – гэта стылізацыя пад народнае гучанне з апорай на фальклорныя песенныя традыцыі беларусаў, дзе сапраўдны толькі паэтычны тэкст твора.

Усё развіццё кантаты "Вясковыя святы" пабудавана на імправізацыйнасці, варыянтнасці – адной з асаблівасцяў беларускага песенна-інструментальнага фальклору. Сюжэтная драматургія твора грунтуецца на асобных нумарах, у цэлым не утвараючы паслядоўнага

сюжэтнага раскрыцця абраду. Аб'яднаныя яны музычна-мастацкімі заканамернасцямі і перш за ўсё інтанацыйнай сувяззю. Кожны голас у партытуры мае сваю ярка выражаную лінію, дзе пераважаюць кварта-квінтовые папеўкі, секундавыя "пампавання" і распяванне крайніх нот. Варта адзначыць, што важную ролю ў кантаце набывае квінтавасць, якая пранізвае гарызанталь і вертыкаль нотнага матэрыялу. Асноўныя тэмы маюць квінтавы дыяпазон, асцінатнае і бурдоннае гучанне квінт выступае ў ролі своеасаблівага пункта. Гэты тыпова фальклорны інтэрвал, яго інтанацыя вызначаюць народны каларыт гучання. Шматгалоссе харавой партытуры пабудавана на гетэрафоніі, што характэрна пераважна для самых старажытных формаў каляндарна-земляробчага і сямейна-абрадавага цыклаў.

Такім чынам, у кантаце "Вясковыя святы" В. Кузняцова народная паэзія з'явілася крыніцай стварэння аўтарскай мелодыі і мелоса ў цэлым, што сведчыць аб глыбокім пранікненні кампазітара ў вобразную сферу фальклору і апасродкаваным яго праламленні. Гэта дазволіла аўтару не слепа капіяваць музычную мову народна-песеннага матэрыялу, а стварыць арыгінальную кампазіцыю – кантату "Вясковыя святы" на народныя тэксты.

***Літаратура***


1. Восеньскія і талочныя песні / Склад. А. С. Ліс, С. Т. Асташэвіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 678 с.
2. Можейко, З. Я. Календарно-песенная культура Белоруссии / З. Я. Можейко. – Минск : Наука и техника, 1985. – 247 с.
3. Пилипенко, М. Ф. Обряд / М. Ф. Пилипенко // Энцыкл. літ. і мастацтва Беларусі. – Минск : Бел. сав. энцыкл., 1984. – Т. 1. – С. 13.


## КОМПОЗИТОРСКИЙ И ИСПОЛНИТЕЛЬСКИЙ СТИЛЬ РИШАРА ГАЛЬЯНО


***Шугаев Александр Михайлович, Юнусов Алексей Николаевич,***
УО «Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка» (Республика Беларусь)



*Аннотация.* В статье рассматривается современное баянно-аккордеонное исполнительское искусство, анализируются исполнительские особенности музыки и композиторский стиль Ришара Гальяно, выявлены характерные признаки нового в аккордеонном искусстве стиля – «New musette».



*Ключевые слова*: «Новый мьюзет»; джаз; композиторский стиль; аккордеонное искусство; исполнительское искусство.


Ришар Гальяно – всемирно известный французский виртуоз-исполнитель и композитор, джазовый аккордеонист. На своей родине, во Франции, он признан как «Священный монстр джаза». Р. Гальяно вошел в историю как основатель нового музыкального стиля «Новый мьюзет» («*New musette*»), основанного на синтезе джазового и народно-инструментального искусства [1; 3].

Р. Гальяно родился 12 декабря 1950 г. в г. Канны, на юге Франции. По примеру своего отца, Люсьена Гальяно, он начал играть на фортепьяно и на аккордеоне в самом юном возрасте, с четырех лет. Профессиональное музыкальное образование Р. Гальяно получил в консерватории г. Ницца, где он изучал гармонию, контрапункт и тромбон.